**А. Р. Агееў** *(Магілёў, Беларусь)*

# СТАРОНКІ ГІСТОРЫІ МСЦІСЛАЎСКАЙ МУЖЧЫНСКАЙ ГІМНАЗІІ

Адным з шматпакутных помнікаў Мсціслава з'яўляецца будынак яе былой мужчынскай гімназіі, у якім у савецкі час дзейнічаў педагагічны тэхнікум з сямігадовай школай, а пазней СШ № 1 і які так пакутліва доўга чакае сваёй рэстаўрацыі. Чакае свайго даследчыка і гісторыя мужчынскай гімназіі. У кнігах па гісторыі Мсціслава сюжэтам па гісторыі мужчынскай гімназіі нададзена па некалькі радкоў[1]. Адзін абзац інфармацыі аб ёй маецца ў абагульняльнай працы па гісторыі адукацыі Магілёўшчыны[2]. Столькі ж інфармацыі ўтрымліваецца ў даведачнай літаратуры аб архітэктуры самога будынка[3]. Нягледзячы на нешматлікасць публікацый па гісторыі гімназіі, матэрыялаў па яе гісторыі захавалася параўнальна многа. У Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь захоўваецца 32 адзінкі захоўвання фонда 2262 «Мсціслаўская мужчынская гімназія папячыцеля Віленскай навучальнай акругі, горад Мсціслаў Мсціслаўскага павета Магілёўскай губерні 1906–1917»[4].

У 1906 г. на сродкі мясцовай супольнасці ў Мсціславе была адкрыта мужчынская гімназія, якая першапачаткова бясплатна

---

[1] *Ткачоў М. А., Трусаў А. А.* Старажытны Мсціслаў. Мінск, 1992. – 109 с.

[2] *Науменко В. В.* Очерки истории образования Могилевщины / В. В. Науменко, В. С. Богданов, А. Г. Агеев, под общ. ред. Л. С. Смотрицкого. Могилев, 2012. С. 152.

[3] Мсціслаўскай мужчынскай гімназіі будынак // Архітэктура Беларусі: энцыкл. даведн. Мінск, 1993. С. 351–352.

[4] НГАБ. Ф. 2262. Воп. 1. Адз. зах. 1–32.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

размяшчалася ў гарадскім будынку[5]. Спецыяльны цагляны будынак для мужчынскай гімназіі быў узведзены ў 1908 г. Двухпавярховы мураваны Т-падобны ў плане будынак мае калідорную сістэму планіроўкі і складаецца з трох злучаных паміж сабою корпусаў. Яго галоўны фасад фланкіраваны рызалітамі, расчлянёны высокімі паўцыркулярнымі вокнамі, якія былі вузкімі на першым і шырокімі на другім паверсе. Над цэнтральным уваходам маецца лучковы аконны праём з кілепадобным франтонам. Карніз падзяляе фасады на два паверхі. Будынак гімназіі лічыцца помнікам архітэктуры эклектыкі[6], ён адпавядаў тагачасным патрабаванням школьнай гігіены. Ён быў абсталяваны вентыляцыяй па сістэме Цімаховіча. Класы былі сухія, цёплыя і светлыя. У ім меліся і кватэры для служачых[7].

Дырэктарам гімназіі ў 1906–1911 гг. быў вядомы беларускі педагог і краязнаўца У. Краснянскі. Па няпоўных звестках настаўнікамі працавалі Ф. Погулеўскі, А. Жунін, калежскі асэсар П. Восіпаў і інш. Ганаровым папячыцелем навучальнай установы быў доктар медыцыны В. Пятроў[8].

Напрыканцы 1908–1909 навучальнага года ў гімназіі навучалася 173 навучэнцы, а на 1 студзеня 1910 г. было 197 гімназістаў. Найбольшая колькасць хлопчыкаў паходзіла з мяшчанскіх сем'яў, таксама ў парадку памяншэння было шмат дваранскіх, сялянскіх і дзетак свяшчэннікаў. З іх праваслаўных было 134 вучні (68,02 %), каталікоў – 25 (12,69 %) і 38 (19,28 %) іўдзееў[9]. Напачатку яўрэяў прымалі з разліку 10 % нормы на агульную колькасць навучэнцаў, а не асобных класаў. Працэнтная норма дзейнічала для яўрэеў, якія ўтрымоўваліся на сродкі дзяржаўнага казначэйства. Для навучальных устаноў, якія дзейнічалі на сродкі грамадскіх органаў або прыватных асоб, яна ўводзілася паступова. Гэтая норма 22 жніўня 1909 г. была павялічана да 15 %. Нягледзячы на гэта, 24 жніўня 1909 г. педагагічны савет залічыў шэсць навучэнцаў хрысціян на воль-

[5] НГАБ. Ф. 2262. Воп. 1. Адз. зах. 11. Арк. 21.

[6] Мсціслаўскай мужчынскай гімназіі будынак. С. 351–352.

[7] *Науменко В. В.* Очерки истории образования Могилевщины. С. 152.

[8] Тамсама. С. 152.

[9] НГАБ. Ф. 2262. Воп. 1. Адз. зах. 11. Арк. 6.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ныя вакансіі ў асноўныя класы гімназіі і прасіў залічыць аднаго з паспяхова вытрымаўшых іспыты яўрэйскіх хлопчыкаў. Але ім было адмоўлена ў сувязі з перавышэннем 10 % нормы для асоб іўдзейскага веравызнання[10]. Тым не менш паступова колькасць яўрэйскіх навучэнцаў расла і перавысіла норму.

Плата за навучанне напачатку «ў павагу да панесеных горадам выдаткаў», як на ўтрыманне гімназіі, так і на ўзвядзенне для яе цалкам зручнага вялізнага мураванага будынка, была параўнальна невысокай: 50 руб. у год у нармальных, і 40 руб. у падрыхтоўчых класах. Пакуль гімназія месцілася ў бясплатным гарадскім будынку, гэтай аплаты было дастаткова, бо не было выдаткаў на ўтрыманне свайго будынка. Нават заставаліся сродкі на набыццё неабходнага першапачатковага абсталявання. Пераход гімназіі 23 жніўня 1908 г. у новы пабудаваны для яе будынак павялічыў выдаткі на закупку мэблі, ацяпленне і г. д. Педагагічны савет хадайнічаў аб павелічэнні аплаты да 60 руб. у асноўных, і 50 руб у падрыхтоўчых класах[11].

Пры гэтым ва ўстанове існавалі ільготы для розных катэгорый навучэнцаў. Педагагічны савет 10 верасня 1909 г. вызваліў частку навучэнцаў ад аплаты за навучанне ў гімназіі: А) 12 дзяцей служачых, або тых, хто праслужыў не менш 10 гадоў «па вучэбнай частцы» ў Міністэрстве народнай асветы; Б) 19 лепшых вучняў у ліку 10 %, «якія заслужылі гэтай ільготы па сваіх поспехах»; плюс аднаго ўнука севастопальскага ветэрана (маецца на ўвазе ўнук удзельніка абароны Севастопаля 1854–1855 гг. – *А. А.*). Некалькіх гадаванцаў педсавет не змог цалкам вызваліць ад аплаты за навучанне, так як квота ў 10 % была ўжо занята, але «прымаючы на ўвазе поспехі і беднасць» апошніх 10 чалавек атрымалі дапамогу па 10–20 руб. кожнаму[12]. Вызваленне ад аплаты давалася на паўгады і абмяркоўвалася па паўгоддзях. У студзені наступнага 1910 г. па гэтых самых прынцыпах было вызвалена ад аплаты адпаведна 16, 15, адзін навучэнец, а ў верасні 1910 г. – 25, 22, і адзін навучэнец[13].

---

[10] НГАБ. Ф. 2262. Воп. 1. Адз. зах. 8, Арк. 16–17; Адз. зах. 12. Арк. 37.
[11] Тамсама. Адз. зах. 11. Арк. 21–23.
[12] Тамсама. Адз. зах. 8. Арк. 20.
[13] Тамсама. Адз. зах. 11. Арк. 11; Адз. зах. 12. Арк. 27.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Казна пачала выдаткоўваць на гімназію грошы ў 1908 г. – 12 485 руб., у 1913 г. – 26 160 руб.[14] Сродкі на ўтрыманне гімназіі паступалі таксама ад мецэнатаў, фундатараў і ахвярадаўцаў. Так, у 1909 г. князь В. С. Мяшчэрскі прапанаваў кнігі «з вялікай саступкай для гімназіі». Педагагічны савет 27 жніўня прапанаваў набыць іх за 130 руб.[15]

Ганаровы папячыцель Мсціслаўскай гімназіі сапраўдны стацкі саветнік Веранін неаднаразова ахвяраваў вялікія сумы грошаў. На педагагічным савеце 15 сакавіка 1909 г. было паведамлена аб зацвярджэнні трох стыпендый імя В. І. Вераніна для навучэнцаў гімназіі хрысціанскай веры без адрознення па саслоўях, якія нарадзіліся ў Мсціславе або Мсціслаўскім уездзе, на 5 % гадавых ад ахвяраваных ім 6000 руб. Савет пастанавіў плаціць тры стыпендыі па 80 руб і адну – 60 руб.[16] На педагагічным савеце 28 верасня 1910 г. было паведамлена аб ахвяраванні ім 3000 руб. асігнацыямі пяціпрацэнтнага ўнутранага займа пры заяве: 1) на шэсць стыпендый для навучэнцаў Мсціслаўскага гарадскога вучылішча; 2) капітал захоўваецца ў ліку спецыяльных сродкаў гімназіі недатыкальным; 3) карыстанне стыпендыяй не накладае на стыпендыята ніякіх акрамя маральных абавязкаў; 4) у выпадку закрыцця гарадскога вучылішча сродкі фонда ідуць на тры стыпендыі гімназіі. Права абіраць стыпендыятаў было ў В. І. Вераніна, а па смерці яго – у педагагічнага савета. Стыпендыятаў маглі лішыць стыпендыі ў выпадку дурных паводзін або кепскай вучобы. У верасні гэтага ж года абмяркоўвалася і адна стыпендыя у гонар стагоддзя існавання Віленскай навучальнай акругі[17].

Праграмы выкладання прадметаў на першыя класы былі зацверджаны адразу ў 1906 г., а затым удакладняліся і прымаліся па меры з'яўлення новых класаў. Выкладаліся: Закон Божы, руская, лацінская, французская і нямецкая мовы, чыстапісанне, рысаванне, арыфметыка, алгебра, геаметрыя, геаграфія, гісто-

[14] *Науменко В. В.* Очерки истории образования Могилевщины. С. 152.
[15] НГАБ. Ф. 2262. Воп. 1. Адз. зах. 8. Арк. 20.
[16] Тамсама. Адз. зах. 11. Арк. 26.
[17] Тамсама. Адз. зах. 12. Арк. 34–35, 38.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

рыя, прыродазнаўства[18]. Выкладанне прадметаў павінна было весціся выключна па тых падручніках і дапаможніках, якія былі дазволены вышэйшымі органамі. Выкладанне па «недапушчаных» дапаможніках лічылася грубым «прамым парушэннем службовых абавязкаў» з боку выкладчыцкага персаналу або педагагічных саветаў, недаглядам з боку начальніка навучальнай установы, аб чым неаднаразова нагадвалі лісты з Міністэрства і навучальнай акругі. За такія парушэнні была прадугледжана асабістая дысцыплінарная адказнасць[19].

У класах вучылася ад 20 да 40 гімназістаў. Колькасць навучэнцаў была максімальнай у малодшых класах і паступова змяншалася ў старэйшых. Назіралася нават перавышэнне камплекту класа, які па нормах павінен быў быць не большым за 40 навучэнцаў у адным класе. У 1910 г. намі зафіксавана 48 гімназістаў у другім класе гімназіі. Такое перавышэнне магло быць выклікана пакіданнем навучэнцаў на другі год навучання. Мінімальная колькасць гімназістаў у адным класе – 19 адзначана ў гэтым жа годзе ў пятым класе[20].

Праверка ведаў гімназістаў здзяйснялася на ўроках, шляхам напісання пісьмовых работ і здачы іспытаў. Гімназісты пісалі даволі многа кантрольных пісьмовых работ. Так, толькі па арыфметыцы ў першым і другім класах іх было восем у год, а ў трэцім – пятым класах – па чатыры ў год. Былі і экзаменацыйныя пісьмовыя іспыты[21].

Паспяховасць гімназістаў не была высокай, бо настаўнікі былі патрабавальнымі. Мелася тэндэнцыя да павышэння паспяховасці ў старэйшых класах як дзякуючы якасці навучання, так і шляхам адсеву слабых па поспехах гімназістаў. Найбольш цяжкім часам навучання ўяўляюцца другі і трэці класы гімназіі.

Працэнт гімназістаў, якія паспявалі па ўсіх прадметах[22]:

---

[18] НГАБ. Ф. 2262. Воп. 1. Адз. зах. 11. Арк. 2.

[19] Тамсама. Адз. зах. 19. Арк. 2.

[20] Тамсама. Адз. зах. 12. Арк. 45.

[21] Тамсама. Адз. зах. 8. Арк. 36–38.

[22] Тамсама. Арк. 58–59; Адз. зах. 12. Арк. 45.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

| Дата\клас | Падрыхтоўчы | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 чвэрць 1909 г. | 70,9 | 43,9 | 35,7 | 42,1 | – | 60,9 | – |
| 2 чвэрць 1909 г. | 83,9 | 56,1 | 28,6 | 36,8 | 45,5 | 52,2 | – |
| 1910 г. | 62,5 | 60 | 43,7 | 31,7 | 54,2 | 52,6 | 76,2 |

З табліцы бачна, што не ўсе навучэнцы паспяхова вучыліся, бо патрабаванні былі высокімі. Так, педагагічны савет 24 жніўня 1909 г. пакінуў на другі год навучання ў другім класе аднаго гімназіста «за няяўкаю на экзамен» і пяць па поспехах, у трэцім класе пакінуў аднаго, а ў чацвёртым двух навучэнцаў. Гэтым жа пратаколам былі «звольнены» з гімназіі пяць навучэнцаў, якія правучыліся па два гады ў адным класе і не паказалі належных поспехаў. На іх месца быў прыняты ў трэці клас адзін навучэнец, які вытрымаў прыёмныя іспыты, а 15 кандыдатам у розныя класы было адмоўлена, бо яны не вытрымалі іспыты. Прычынай адмовы ў прыёме ў гімназію мог быць і поўны камплект гімназістаў у пэўным класе, які складаў 40 чалавек. Адначасова было пастаноўлена выдаць тром «хатнім выхаванцам» пасведчанні аб ведах курсаў пэўных класаў гімназіі, а сямі адмоўлена. Дыскусію выклікала просьба пакінуць на трэці год навучання ў чацвёртым класе звольненага з гімназіі за непаспяховасць сына мешчаніна Іосіфа Чаркоўскага. Гімназіст пачынаў вучобу ў прагімназіі Рыльскай. Быў прыняты ў чацвёрты клас мужчынскай гімназіі, але паказваў пасрэдныя веды. Пасля дыскусіі было рэкамендавана яшчэ раз пакінуць гімназіста на другі год навучання[23].

Пры ацэнцы поспехаў навучэнцаў таксама ацэньваліся ўвага, стараннасць і паводзіны гімназіста. Кандуітны журнал фіксаваў парушэнні гімназістаў, што прыводзіла да паніжэння адзнак па паводзінах гадаванцаў. Напачатку працы гімназіі было даволі многа парушэнняў. Так, рашэннем педагагічнага савета ад 22 кастрычніка 1909 г. гімназістам за першую чвэрць зніжаліся адзнакі па паводзінах за: «псаванне класнай лаўкі», «дурныя паводзіны ў царкве і ў класе на ўроках», «падробку адзнакі ў дзённіку», «непадпарадкаванне патрабаванням выкладчыка», «грубыя паводзіны з таварышамі, недарэчныя раз-

[23] НГАБ. Ф. 2262. Воп. 1. Адз. зах. 8. Арк. 10–17.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

мовы з выкладчыкамі і біццё шкла», «ухіленне ад урокаў», «недысцыплінаванасць», «бойкі з таварышамі і страляніну з рагаткі», «надзвычайную няспраўнасць у выкананні вучэбных абавязкаў, невыкананне патрабаванняў выкладчыкаў і ілжывасць», «сталую нястрымную дураслівасць на ўроках і перапынках» і г. д. У выніку па паводзінах былі выстаўлены адна «тройка», дзевяць «чацвёрак», адна «тройка» і 155 «пяцёрак»[24].

Уяўляюць пэўную цікавасць асобныя накірункі вучэбнай і выхаваўчай працы гімназіі. Па праграме на гісторыю ў першым і другім класах адводзілася 56 урокаў. З іх ліку чатыры ўрокі ўмоўна можна аднесці да ўрокаў па гісторыі Беларусі, а дакладней Паўночна-Заходняга краю. Два ўрокі прадугледжваліся на вывучэнне Літоўскага княства, на якіх трэба было распавесці аб Гедыміне і Альгердзе, адносінах да рускай народнасці, св. віленскіх пакутніках. Два ўрокі вывучаліся перамогі Суворава над палякамі і стан Польшчы «перад падзеннем яе»[25].

Па даручэнні Папячыцеля Віленскай навучальнай акругі педсавет гімназіі абмеркаваў 18 кастрычніка 1910 г. пытанне аб фізічным развіцці гадаванцаў. У выніку лепшымі відамі спорта для навучэнцаў з-за наяўнасці снегу, высокай марознасці клімату Мсціслава былі прызнаны бег на лыжах і катанне на каньках. Вырашылі па прыкладзе зімы 1908–1909 гг. «наладзіць» каток за кошт сродкаў гімназіі і выпісаць 10 пар лыж па 8 руб. за пару[26]. І надалей педагогі гімназіі імкнуліся прышчапіць гімназістам уяўленні аб асновах здаровага ладу жыцця і звычку да фізічных практыкаванняў, распрацоўвалі мерапрыемствы па абуджэнні цікавасці гімназістаў да фізічных заняткаў[27].

Значную ўвагу педагагічны калектыў надаваў развіццю мастацкіх здольнасцяў навучэнцаў. Кожная навучальная ўстанова Віленскай акругі штогадова ладзіла выставу рысункаў і малюнкаў, чарцяжоў і прадметаў прыкладнога мастацтва, якія на працягу года выраблялі навучэнцы. Асаблівая ўвага

[24] НГАБ. Ф. 2262. Воп. 1. Адз. зах. 8. Арк. 57–58.
[25] Тамсама. Адз. зах. 3. Арк. 7–9.
[26] Тамсама. Адз. зах. 12. Арк. 40.
[27] Тамсама. Адз. зах. 28. Арк. 1.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

надавалася замалёўкам і мясцовым матывам. 7 лютага 1910 г. педагагічны савет гімназіі абмяркаваў гэтае пытанне ў звязку з тым, што з 15 жніўня па 10 верасня ў Вільні праходзіла агульная выстава прац навучэнцаў акругі[28].

Адной з сур’ёзных праблем навучання была нізкая якасць работ выпускнікоў па рускай мове. Нават правучыўшыся ў гімназіі шмат гадоў, навучэнцы дапускалі сур’ёзныя памылкі на выпускных экзаменах. Гэта не было праблемай адной Мсціслаўскай гімназіі. У снежні 1913 г. на пасяджэннях камісіі «па пытанні аб мерах па падняцці пісьменнасці ў сярэдніх навучальных установах Віленскай навучальнай акругі» было адзначана, што Вучоны камітэт Міністэрства звярнуў увагу на невысокую якасць работ па рускай мове выпускнікоў, асабліва рэальных вучылішч. Так, паводле водгуку акруговага рэцэнзента вынікі пісьмовых іспытаў навучэнцаў сёмага класа рэальных вучылішч пакідаюць «засмучальнае (удручающее – рус.) уражанне», а ў гімназіях маюцца істотныя прамашкі. На думку членаў камісіі кепскія веды былі выкліканы метадычнымі і навучальнымі памылкамі. Але пункт дзявяты фіксуе іншую, на наш погляд, вельмі істотную прычыну – склад навучэнцаў. У ім адзначаецца, што «ў сярэдніх навучальных установах акругі навучаецца шмат іншародцаў, якія размаўляюць па руску амаль выключна толькі ў сценах навучальнай установы, да і тое не заўжды. Сярод жа навучэнцаў не іншародцаў ёсць многа дзетак непісьменных бацькоў, якія дома амаль не чуюць правільнай мовы, а гэта, натуральна, адлюстроўваецца ў пісьмовых работах». Прымаючы захады па выпраўленні сітуацыі, члены камісіі ў тым ліку палічылі неабходным «тлумачыць навучэнцам іншародцам, а ў неабходных выпадках і іх бацькам, важнасць заўсёдашняга практыкавання ў гутарковай рускай мове»[29]. Дакумент яскрава сведчыць, што і ў пачатку XX ст. мясцовае беларускае, польскае, яўрэйскае насельніцтва дома размаўляла на сваіх родных мовах, а беларусы, на думку рускіх шавіністаў, размаўлялі на «няправільнай» рускай мове, што замінала лёгкаму засваенню на ўроках «правільнай» рускай мовы.

[28] НГАБ. Ф. 2262. Воп. 1. Адз. зах. 12. Арк. 49.
[29] Тамсама. Адз. зах. 19. Арк. 17–19.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Заробкі настаўнікаў у 1915 г. складалі 1000–2000 руб. у год. Дырэктар гімназіі О. Панамароў атрымоўваў 1728 руб. жалавання, 436 руб. за ўрокі і 1 728 руб. сталавання[30]. Заробкі выкладчыкаў і дырэктара былі адносна высокімі для ўезда, але не былі надта вялікімі. Для параўнання: дырэктар Магілёўскага настаўніцкага інстытута атрымоўваў 2400 руб. (1200 руб. – жалавання, 800 руб. – сталавання і 400 руб. дадатковага ўтрымання) у год і кватэрныя, а законанастаўнік і выкладчыкі навук інстытута – па 1440 руб. (650 руб. – жалавання, 550 руб. – сталавання і 240 руб. дадатковага ўтрымання). У той жа час сярэдні заробак па Магілёўскай губерні ў 1913 г. складаў 198 руб., а па Беларусі – прыблізна 210 руб. у год[31].

У выпадку неабходнасці настаўнікі маглі разлічваць на дапамогу сваіх калег. На падставе найвышэйшага ўказа ад 4 сакавіка 1906 г. аб таварыствах і саюзах пры ўдзеле работнікаў гімназіі была створана пазыка-ашчадная каса служачых навучальных устаноў горада Мсціслава. 25 сакавіка 1908 г. быў скліканы агульны сход з просьбай зацвердзіць статут касы, ліст аб чым дырэктар гімназіі ў красавіку накіраваў папячыцелю акругі. Адпаведна статуту галоўныя пытанні вырашаў агульны сход і абранае ім праўленне з трох членаў і двух кандыдатаў. Агавораны былі ўмовы ўступлення і выхаду з членаў касы, склікання чарговых і экстранных сходаў, захавання сум, рэвізій, размеркавання прыбыткаў і ліквідацыі касы. «Пэўную долю свайго ўтрымання» ў гэтай касе мог назапашваць персанал мужчынскай гімназіі, прыватнай гімназіі баранэсы Пілар-фон-Пільхаў, трохкласнага гарадскога, прыхадскіх мужчынскага і жаночага вучылішч. Пры часовай неабходнасці ў грошах члены кассы маглі карыстацца пазыкамі. Летам 1910 г. дырэктар Рагачоўскага рэальнага вучылішча прасіў выслаць для ўзору статут пазыка-ашчаднай касы[32].

---

[30] НГАБ. Ф. 2262. Воп. 1. Адз. зах. 24.

[31] Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. А. Куляшова: мінулае і сучаснасць / А. Р. Агееў, В. А. Бандарэнка, С. А. Парашкоў, П. Г. Рабзонаў [і інш.]; пад рэд. В. І. Вішнеўскага. Магілёў, 2003. С. 20–21.

[32] НГАБ. Ф. 2262. Воп. 1. Адз. зах. 4. Арк. 2–6.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

У гімназіі праводзіліся пісьмовыя іспыты для асоб, якія прэтэндавалі на званне «пачатковых настаўнікаў» і аптэкарскіх вучняў. Экзамены на настаўніцкае званне было адной з форм дзейнасці гімназіі. Для допуску да здачы іспытаў суіскальнікам звання настаўніка неабходна было прадаставіць пасведчанне аб добранадзейнасці як у маральных, так і палітычных адносінах і адсутнасці судзімасці, напісаць прашэнне на здачу экзамена, прадаставіць квітанцыю казначэйства аб аплаце трох руб. на карысць экзаменатараў Мсціслаўскай мужчынскай гімназіі[33].

Дакументы фонда Мсціслаўскай мужчынскай гімназіі захоўваюць і сведчанні аб карупцыйных праяўленнях у асяродку педагогаў краіны. Папячыцель Віленскай навучальнай акругі ў 1909 г. напісаў прадпісанне аб скаргах, якія прыходзілі ў канцылярыю. У ім адзначана, што яны выклікаены «няўмеснымі размовамі персанала» і тым, што настаўнікі, якія рыхтуюць суіскальнікаў за плату да экзаменаў, самі прымаюць іх, часцяком нічога не гаворачы пра гэта дырэктарам школ[34].

Непрацяглы час існавання Мсціслаўскай мужчынскай гімназіі не дазволіў ёй стаць такой жа вядомай навучальнай установай, як некаторыя іншыя гімназіі Беларусі. У першыя ж гады існавання савецкай улады гімназіі і рэальныя вучылішчы былі закрыты або рэарганізаваны ў агульнаадукацыйныя школы. На базе Мсціслаўскай гімназіі ў савецкі час дзейнічаў педагагічны тэхнікум, сямігадовая, а потым сярэдняя школа. Тым не менш гісторыя станаўлення гімназіі мае не толькі выключна краязнаўчы інтарэс. Гэта тыповая з'ява ў гісторыі сярэдніх навучальных устаноў краіны. У канцы XIX – пачатку XX ст. мужчынскія і жаночыя дзяржаўныя і прыватныя гімназіі і прагімназіі былі адкрыты ў Бабруйску, Быхаве, Глуску, Гомелі, Клімавічах, Мсціславе, Оршы, Чэрыкаве і іншых гарадах і мястэчках Усходняй Беларусі[35]. У асобнай гісторыі адной гімназіі мы маем адлюстраванне агульнабеларускіх тэндэнцый у сферы сярэдняй дарэвалюцыйнай адукацыі.

[33] НГАБ. Ф. 2262. Воп. 1. Адз. зах. 10. Арк. 10–21.
[34] Тамсама. Адз. зах. 11. Арк. 13.
[35] *Науменко В. В.* Очерки истории образования Могилевщины. С. 149–153.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова